# Нашы юбіляры

## ІВАН ІВАНАВІЧ САЧАНКА



Споўнілася 50 год з дня нараджэння доктара гістарычных навук, прафесара, лаўрэата прэміі Саюза журналістаў СССР, загадчыка кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Івана Іванавіча Сачанкі.

І. І. Сачанка нарадзіўся ў сяле Вялікі Бор Хойніцкага раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны фашысцкія захопнікі прымусова ўвезлі ў Германію разам з аднавяскоўцамі сям'ю Сачанкаў. На чужыне прыйшлося пазнаць зняважанні, голад і няволю. Потым — Перамога, вызваленне, вяртанне ў родныя мясціны, вучоба.

Пасля заканчэння сярэдняй школы І. І. Сачанка служыў у радах Савецкай Арміі. У 1960 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З таго часу яго лёс звязан з БДУ. Камуністы філалагічнага факультэта прынялі яго ў 1961 годзе ў члены КПСС. Яшчэ ў час вучобы на пятым курсе пачаў працаваць адказным сакратаром газеты «Беларускі універсітэт». З 1968 года — аспірант. У 1971 годзе датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю і быў залічаны выкладчыкам кафедры гісторыі журналістыкі. На гэтай кафедры ён працаваў старшым выкладчыкам, дацэнтам, а з 1977 па 1986 год — намеснікам дэкана факультэта журналістыкі.

Іван Іванавіч Сачанка вельмі працалюбівы, дапытлівы вучоны. Ім апублікавана каля 100 навуковых работ, у тым ліку 4 манаграфіі, 4 брашуры. За фундаментальны вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускай журналістыкі» (у сааўтарстве з прафесарам Р. В. Булацкім і дацэнтам С. В. Говіным) І. І. Сачанка ўдастоены высокага звання лаўрэата Усесаюзнага конкурсу на лепшую работу па гісторыі, тэорыі і практыцы друку. Брашура «Хто такія беларускія «патрыёты»? выдадзена для замежнага чытача, у ёй пераканальна выкрываюцца злачынныя метады і сродкі ідэалагічных дыверсантаў імперыялізму.

У 1982 годзе І. І. Сачанка паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму: «Публіцыстыка ў барацьбе супраць фашызма і неанацызма: гістарычны вопыт, традыцыі, практыка». З 1985 года — прафесар.

І. І. Сачанка зарэкамендаваў сябе кваліфікаваным выкладчыкам: на высокім навуковым і метадычным узроўні чытае савецкім і замежным студэнтам агульны курс па крытыцы тэорыі і практыцы буржуазнай журналістыкі, спецкурсы і вядзе спецсемінары. За ўдалую лекцыйную прапаганду ўзнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства народнай асветы БССР. Іван Іванавіч Сачанка чытаў лекцыі работнікам сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, а таксама студэнтам Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага, выступаў перад балгарскімі журналістамі і партыйнымі работнікамі з дакладамі па праблемах перабудовы ў нашай краіне і актуальных задачах друку. Ён з'яўляецца старшынёй каардынацыйнага савета па пытаннях ідэалагічнай барацьбы і палітычнага выкрыцця імперыялізму Мінскай гарадской арганізацыі таварыства «Веды». Таварыства «Веды» Беларускай ССР выдала тры яго брашуры ў дапамогу лектарам. Асобнай брашурай пад назвай «Радкі, абарваныя куляй» выдадзены метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню творчасці пісьменнікаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Прафесар Сачанка карпатліва гадуе навуковую змену, паспяхова здзяйсняе кіраўніцтва аспірантамі і студэнцкай навуковай працай.

Свой 50-гадовы юбілей Іван Іванавіч Сачанка сустракае ў росквіце творчых сіл. Студэнты, калегі па рабоце і сябры сардэчна жадаюць яму моцнага здароўя, шчасця, плённай працы.

**П. М. Бараноўскі**